УДК 392+615.89(09)

# Народная педыятрыя беларусаў: традыцыйныя сродкі лячэння дзіцячых хвароб (другая палова XIX – першая палова XXст.)

Якубінская А. Д.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Адпаведна традыцыйных уяўленняў беларусаў, чалавек – гэта элемент космабіялагічнага свету, а яго здароўе гарманічна звязана з прыродай, хваробы сведчаць аб парушэнні гэтай сувязі. Менавіта таму вызваленне ад хваробы можна атрымаць толькі ад самой прыроды. Сярод усходніх славян, у тым ліку і беларусаў, было распаўсюджана ўяўленне аб узаемнай сувязі чалавека і дрэва, якое быццам бы надае яму жыццёвую сілу і здароўе, аб чым сведчыць агульнаславянская этымалогія слова “здароўе”, якое паходзіць ад слова “дрэва”. Узгадаем таксама звычай “сцябаць” галінкамі вярбы на Вербную Нядзелю людзей і жывёлу, звычай пасадкі дрэва, калі ў сям’і нараджаецца дзіця. Такім чынам, у традыцыйным сялянскім грамадстве беларусаў здароўе мела большы сацыяльны прэстыж, чым у сучасным. Увогуле для беларускай традыцыйнай культуры была характэрна ўстаноўка на здароўе, на здаровы лад жыцця з моманту нараджэння чалавека. Прыкладам таму могуць быць пажаданні здароўя немаўляці ў такой спецыфічнай з’яве беларускага сямейнага фальклору, як хрэсьбінныя песні. Сярод іх даследчыкі вылучаюць “песні-зычэнні”, у якіх часта сустракаюцца пажаданні здароўя немаўляці.

Можна вылучыць наступныя метады і прыёмы народнай педыятрыі - культура кармлення і харчавання, дзіцячая вопратка, спецыяльныя прылады для авалодання тэхнікай цела, асабістая гігіена, рэжым дня і лячэнне хвароб. Яны неслі для дзяцей першай полаўзроставай ступені – “анёлкаў” (ад нараджэння да 2-3 год) - важныя адаптацыйныя і сацыялізуючыя сэнсы, але галоўная іх функцыя – прыстасаванне дзяцей да здаровага ладу жыцця, выхаванне паўнавартасных членаў сялянскай абшчыны.

Традыцыйныя спосабы лячэння дзіцячых хвароб з’яўляюцца найменш даследаваным і вельмі абшырным пластом народнай медыцынскай культуры. У народнай педыятрыі беларусаў

вылучаюцца два накірункі лячэння дзіцячых хвароб – магічнымі сродкамі і лекавымі травамі.

Да першай групы можна аднесці такую хваробу, як "зубішча" (цемяннік) – пагаршэнне фізічнага стану дзіцяці, звязанае са зніжэннем імунітэту падчас прарэзвання зубоў. Каб аблегчыць прарэзванне зубоў, скроні дзіцяці змазвалі сумессю матчынага малака з сокам часнаку, гаворачы адмысловую замову. "Шчацінка" на спіне дзіцяці з'яўляецца, на думку сялянак, калі цяжарная жанчына пне нагой хатнюю жывёлу. Лячылі "шчацінку" наступным чынам: на матчыным малацэ замешвалі невялікі кавалак цеста і качалі яго па спіне дзіцяці, або клалі дзіця на тое месца, дзе ляжаў кот ці сабака і качалі яго. Досыць распаўсюджанай хваробай былі "шчэміны" ("падбела", "малочніца") – белы налёт на языку і дзёснах дзіцяці, які выціралі валасамі маці, ці чырвоным шарсцяным касніком. Да цяперашняга часу вельмі распаўсюджаным захворваннем дзіцяці з'яўляюцца апрэласці. Лячэнне гэтай хваробы цесна звязана з працэдурай купання. Пасля купання перад тым, як спавіць дзіця, ў паху і пад мышкамі перасыпалі крухмалам, маці палівала халоднай вадой з рота, засыпала "чарваточынай" (пылком дравеснага чарвяка) ці пылком дзеразы, якую збіралі ў лесе.

Існавалі яшчэ дзве групы хвароб, якія часам атаясамліваліся, і спосабы іх лячэння былі практычна аднолькавымі – гэта "урокі" ("зглаз", "пярэпалахі", "спалох", "лякі") і "начніцы" ("крыксы", "плаксы"). "Узварушыць ці сурочыць душу чалавека " можна "дурным вокам" або здзіўленнем ("падзіў"). Найбольш карыснымі сродкамі лячэння сурокаў з'яўляюцца наступныя: прыём прапускання дзіцяці паміж целам і кашуляй маці або праз бацькавы нагавіцы, выціранне падолам, высмоктванне ў вобласці вачэй і сэрца, абкурванне смеццем або валасамі таго чалавека, які сурочыў. Існаваў нават спосаб "выпарвання" сурочанага дзіця: вечарам трэба прынесці са студні вады, якую нельга нікуды адліваць, закіпяціць яе тры разы, паставіць пад калыску дзіцяці міску, а вакол разлажыць ключ, грэбень, шчотку, нож і тры верацяна, потым у міску перавярнуць гаршчок з кіпнем і пакінуць на ноч. Такі спосаб, на нашу думку, звязаны з верай сялян у ачышчальную сілу вады. Апытаныя намі рэспандэнткі распавядалі аб такім сродку лячэння ад

сурокаў, як "выкачванне" – па жывоціку сурочанага дзіцяці бабка вадзіла кавалкам цеста або хлеба і шаптала замову.

Часам сурок мог спрычыніць начніцы, прыкметамі якіх былі вялікі жывоцік, начныя плачы і бяссонніца. А.Я. Багдановіч, бацька нашага славутага паэта Максіма Багдановіча, апісвае цікавы абрад лячэння начніцаў – "паланне" дзіцяці: маці кладзе дзіця ў прыпол і некалькі разоў качае яго перад полымем печы, гаворачы пры гэтым замову. Адна з рэспандэнтак так апісвала працэс лячэння начніцаў у яе дачкі: "Бабка ўзяла засланку ад печы, пасеяла на яе попел праз рэшата і паставіла дзіця на яго ножкамі, са слядкоў узяла попел і скатала яго ў тры галушачкі, а потым качала іх па жывату дачкі, шэпчучы замову". Звяртанне дзіцяці ў печ сімвалізуе зварот дзіця ў матчыну ўтробу і новае нараджэнне. Так ці іначай, прыведзеныя намі магічныя спосабы лячэння гэтай групы хвароб таксама адбывалася пры дапамозе агульнага для ўсходніх славян мацярынскага сімвала – печы. Існавалі таксама і спосабы лячэння гэтых хваробаў пры дапамозе зёлкаў: дзецям давалі піць адвары піжмы і ваўчкоў (чартапалоху) , купалі ў адварах такіх раслін, як буслікі (журавельчыкі), малачайнік (агародны асот).

Часам, у малых дзяцей бываюць сударагі, якія могуць быць выкліканы не толькі спалохам, але і глістамі, запорамі, прарэзваннем зубоў. Такая хвароба ў сялян называлася "радзімец" ("дзяцінец", "падучая хвароба"). "Радзімец" лячыўся працягваннем дзіцяці праз хамут. А старажытнарускі лячэбнік прапаноўваў насіць на шыі такую расліну, як параступень. Дзецям давалі піць адвар карэння такой расліны, як "драсён вужоўнікавы".

Грыжу таксама лячылі замовамі, абвязаўшы жывоцік дзіцяці чырвонай ніткай, якая, магчыма, сімвалізавала ахоўную сілу пояса. У XIX ст. у Себежскім павеце Віцебскай губерніі, калі бабка-павітуха выяўляла ў дзіцяці прызнакі грыжы, яна лавіла мыш, разрывала яе за заднія лапкі і прыкладала яе да грыжы. Такі магічны спосаб лячэння пры дапамозе хтанічнай жывёлы сведчыць аб успрыманні нованароджанага, як прадстаўніка таго свету, таму і хвароба, з якой ён нарадзіўся, павінна была пакінуць яго са смерцю прадстаўніка таго свету – мышы.

Існаваў цікавы прыклад лячэння "вогніку" (дыятэзу на твары дзяцей): "на зыходзе" месяца ці на "маладзік" бабка-шаптуха

ставіць на загнёт патэльню, кладзе ў яе некалькі вугольчыкаў, здабытых з-пад каранёў крапівы, якая расце на папялішчах, зверху кладзе некалькі шчэпак, усе гэта падпальвае і залівае вадой. Калі ўсе гэта патухае, бабка макае палец у гэту ваду і абводзіць ім тры разы хворы тварык дзіцяці, гаворачы замову, прымушае дзіця тры разы павярнуцца і плюнуць. Ваду з вугольчыкамі бабка злівае ў шкляначку і прапаноўвае свайму пацыенту выкарыстоўваць яе ў якасці прымочкі раніцай і вечарам. Выкарыстанне ў якасці лекавага сродку вугля тлумачылася верай у ачышчальную сілу агню. Лекавая функцыя вугля выкарыстоўваецца і ў сучаснай педыятрыі у якасці абсарбента пры эксудатыўных дыятэзах, выкліканых пагрэшнасцямі ў кармленні дзяцей.

Захаваліся сведчанні таго, што і самі дзеці маглі выконваць ролю “лекара” пры дапамозе магічных спосабаў. Так, для прафілактыкі зубнога болю сяляне насілі на шыі чырвоны шнурок з 27 вузельчыкамі, завязаць якія павінна было старэйшае або малодшае дзіця ў сям’і, палічыўшы тры разы да дзевяці не пераводзячы духу.

Калі замовы і іншыя магічныя сродкі не дапамагалі, сялянкі звярталіся да лячэння “зёлкамі”. Налічваецца каля 300 відаў раслін, якія выкарыстоўваліся беларусамі для лячэння, найвялікшую групу сярод іх складаюць расліны, якімі лячылі страўнікавыя захворванні. Увогуле, адной з самых распаўсюджаных хвароб сярод дзяцей была дызентэрыя, якую лячылі чарнічным або журавінавым кісялём. Ад глістоў дзецям давалі піць распушчаны ў вадзе “цэдар” аўсу (пераквашанае рэдкае цеста з аўсянай мукі), часнок. Калі ў дзіцяці проста балеў жывоцік, то грэлі прасам невялікую полачку і прыкладалі яе да жывата, дзіця хутка супакойвалася. Яшчэ адной досыць распаўсюджанай хваробай сярод дзяцей была залатуха. Залатушных дзяцей купалі ў адварах з аеру, адварах дубоўкі, з лазы, у вотрубях пшаніцы, мазалі гусіным салам. Спецыфічныя інфекцыйныя дзіцячыя хваробы лячылі пры дапамозе гародніны: ад водру давалі адвар з паранага насення рэпы, а ад коклюшу лячылі адварам кветак бульбы. Шмат хварэлі дзеці і прастуднымі захворваннямі, якія лячылі адварам ліпавага цвету; маліннік быў вядомы як патагонны сродак.